граждан о принятых решениях путем размещения информации не только на сайтах республиканских органов государственного управления, но и на отдельном, специальном сайте.

**Библиографический список**

1. Результаты деятельности общественно-консультативных советов и рабочих групп при органах госуправления [Электронный ресурс] // М-во экономики Респ. Беларусь. – Режим доступа: http://www.economy.gov.by/ru/rezultaty-deyatelnosti-hfbochih-grupp-ru/. – Дата доступа: 30.08.2019.

2. Руденко, В. Н. Консультативные общественные советы: особенности организации и деятельности [Электронный ресурс] / В. Н. Руденко // Политэкс. – 2006. – № 3. – Режим доступа: http://www.politex.info/content/view/271/30. – Дата доступа: 30.08.2019.

3. Дзидзоев, Р.М. К вопросу об Открытом Правительстве в России / Р. М. Дзидзоев // Гос. власть и местное самоуправление. – 2013. – № 7. – С. 35–38.

4. Доклад об итогах внедрения системы «Открытое правительство» и перспективах до 2024 года [Электронный ресурс] // Открытое правительство. – Режим доступа: https://report.open.gov.ru/assets/doc.pdf. – Дата доступа: 30.08.2019.

5. Общественные советы [Электронный ресурс] // Открытое правительство. – Режим доступа: https://open.gov.ru/os/os/. – Дата доступа: 30.08.2019.

***Дашкевіч Аляксандр Леанідавіч***

## АБ'ЯДНАННІ ПРАДПРЫМАЛЬНИКАЎ ЯК СУБ'ЕКТЫ САЦЫЯЛЬНАГА ПАРТНЕРСТВА: АСОБНЫЯ АСПЕКТЫ РАЗВІЦЦЯ КАНСТЫТУЦЫЙНА-ПРАВАВОГА РЭГУЛЯВАННЯ

Дэкан факультэта эканомікі і бізнесу УА «Інстытут прадпрымальніцкай дзейнасці», кандыдат гістарычных навук, дацэнт, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь, ladminsk@mail.ru

Важным элементам функцыянавання і развіцця сацыяльнай дзяржавы з'яўляецца сацыяльнае партнёрства, заснаванае у тым ліку на ўдзеле ў ім аб'яднанняў прадпрымальнікаў. Выяўляючы інтарэсы прадпрымальніцкіх супольнасцяў, такія аб'яднанні выступаюць у якасці важных партнёраў дзяржаўных органаў пры ажыццяўленні сацыяльна-эканамічнай палітыкі. У межах урадавай стратэгіі развіцця малога і сярэдняга прадпрымальніцтва «Беларусь – краіна паспяховага прадпрымальніцтва» на перыяд да 2030 года (далей – стратэгія) аб'яднанням прадпрымальнікаў прадстаўляюцца значныя магчымасці ў арганізацыі яе выканання, замацоўваецца іх удзел у падрыхтоўцы «дарожнай карты» рэалізацыі стратэгіі.

На канстытуцыйным узроўні аб'яднанні прадпрымальнікаў у дачыненні сацыяльнага партнёрства прадстаўлены ў форме аб'яднанняў наймальнікаў. У арт. 14 Канстытуцыі Беларусі аб'яднанні наймальнікаў замацаваны ў якасці суб'ектаў узаемадзеяння ў сацыяльна-працоўнай сферы разам з прафесійнымі саюзамі і органамі дзяржаўнага кіравання. Паводле арт. 1 дзеючага Працоўнага кодэксу Рэспублікі Беларусь (далей – кодэкс) пад аб'яднаннямі наймальнікаў разумеюць дабравольныя аб'яднанні юрыдычных і фізічных асоб, якім заканадаўствам прадстаўлена права заключэння і спынення працоўнага дагавора з работнікам, якія маюць мэту прадстаўніцтва і абароны сваіх правоў і законных інтарэсаў. У новай рэдакцыі кодэкса (уступіць у сілу 28 студзеня 2020 г.) да такіх аб'яднанняў адносяць некамерцыйныя арганізацыі, якія аб'ядноўваюць на падставе дабравольнага членства наймальнікаў для прадстаўніцтва і абароны іх правоў і законных інтарэсаў у сацыяльна-працоўнай сферы. Тым самым заканадавец ліквідуе існуючую на сёння неадпаведнасць дадзенай нормы арт. 121 Грамадзянскага кодэксу Рэспублікі Беларусь, дзе прадугледжваецца магчымасць стварэння камерцыйнымі арганізацыямі і (або) індывідуальнымі прадпрымальнікамі, а таксама камерцыйнымі і (або) некамерцыйнымі арганізацыямі аб'яднанняў у форме асацыяцый ці саюзаў. У свой час мы адзначалі неабходнасць такога ўдакладнення [1].

Паняцці аб'яднання наймальнікаў і аб'яднання прадпрымальнікаў блізкія па сваім змесце, але не тоесныя. Розніца найперш звязана з суб'ектным складам такіх аб'яднанняў. У межах легальнага паняцця пад наймальнікамі разумеюць юрыдычных і фізічных асоб, якім заканадаўствам прадстаўлена права заключэння і спынення працоўнага дагавора з работнікам. У сваю чаргу суб'екты прадпрымальніцкай дзейнасці (юрыдычныя і фізічныя асобы) валодаюць правам заключэння і спынення працоўнага дагавора з работнікам і адпаведна адначасова з'яўляюцца наймальнікамі. З другога боку не ўсе наймальнікі могуць ажыццяўляць прадпрымальніцкую дзейнасць і выступаць ў якасці адпаведных суб'ектаў.

У дачыненні асобных аб'яднанняў прадпрымальнікаў, створаных у форме асацыяцый (саюзаў), замацаваны асаблівасці прававога рэгулявання, звязаныя ў той ці іншай ступені з сацыяльным партнёрствам, напрыклад, у дачыненні аб'яднанняў суб'ектаў малога і (або) сярэдняга прадпрымальніцтва. У арт. 18 Закона Рэспублікі Беларусь ад 1 ліпеня 2010 г. «Аб падтрымцы малога і сярэдняга прадпрымальніцтва» прадугледжваецца права такіх аб'яднанняў удзельнічаць у правядзенні дзяржаўнымі органамі і іншымі

арганізацыямі апытанняў суб’ектаў малога і сярэдняга прадпрымальніцтва па выяўленні праблемных пытанняў ажыццяўлення прадпрымальніцкай дзейнасці, высвятлення іх пазіцыі наконт мэтазгоднасці прыняцця выпрацоўваемых мер дзяржаўнай палітыкі ў сферы прадпрымальніцтва, фарміраванні і рэалізацыі дзяржаўных праграм у сферы дзяржаўнай падтрымкі малога і сярэдняга прадпрымальніцтва.

З гэтага вынікае, што ў межах сацыяльнага партнёрства, змест якога прадстаўлены ў арт. 14 Канстытуцыі і дэталізаваны ў арт. 352 кодэксу, аб’яднанні прадпрымальнікаў у форме асацыяцый (саюза) выступаюць у якасці аб’яднанняў наймальнікаў і маюць адпаведную правасуб’ектнасць. Даследчыкі адзначаюць, што роля аб’яднанняў прадпрымальнікаў як суб’ектаў сацыяльнага партнёрства ў фарміраванні прынцыпаў сацыяльнай адказнасці бізнесу вельмі высокая [2, с. 145]. У гэтым кантэксце існуе неабходнасць больш шырокага выкарыстання ў праватворчай і правапрымяняльнай практыцы палажэнняў Канвенцыі МАП № 87 «Аб свабодзе асацыяцый і абароне права на арганізацыю», вывучэнне вопыту Расійскай Федэрацыі, дзе з 27 лістапада 2002 г. дзейнічае спецыяльны Федэральны закон «Аб аб’яднаннях работадаўцаў», які садзейнічае арганізацыйнай пабудове сістэмы сацыяльнага партнёрства, прыняцця асобнага закону аб аб’яднаннях наймальнікаў (спробы падрыхтоўкі якога ажыццяўляліся раней) [3, 4].

З другога боку ў Канстытуцыі, напрыклад, у арт. 4, 5, 33 выкарыстоўваецца дэфініцыя «грамадскае аб’яднанне», змест якой замацаваны ў арт. 1 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб грамадскіх аб’яднаннях» (у вузкім сэнсе) [5]. Згодна з ім грамадскім аб’яднаннем з’яўляецца дабравольнае аб’яднанне грамадзян, ва ўстаноўленым парадку аб’яднаўшыхся на падставе агульнасці інтарэсаў для задавальнення нематэрыяльных патрэбаў і дасягнення статутных мэтаў. Такім чынам, аб’яднанні прадпрымальнікаў могуць існаваць і ў форме грамадскіх аб’яднанняў. Пры гэтым, такія аб’яднанні выступаюць у якасці асобнага віду грамадскіх аб’яднанняў, які вызначаецца паводле мэты і сферы дзейнасці, разам з маладзежнымі, дзіцячымі, жаночымі, ветэранскімі і іншымі. Адначасова ў заканадаўстве адсутнічаюць акрэсленыя крытэрыі адносна складу адпаведнага грамадскага аб’яднання для вызначэння яго як аб’яднання прадпрымальнікаў.

На аб’яднанні прадпрымальнікаў, у залежнасці ад формы іх стварэння, распаўсюджваюць свае дзеянне адпаведныя канстытуцыйныя нормы і нормы іншых нарматыўных прававых актаў, якія дзейнічаюць

адносна аб’яднанняў наймальнікаў, грамадскіх аб’яднанняў, асацыяцый і саюзаў. Пры гэтым нормы, якія вызначаюць прававы статус аб’яднанняў наймальнікаў, распаўсюджваюць сваё дзеянне на аб’яднанні прадпрымальнікаў, створаныя менавіта ў форме асацыяцыі або саюза, што вынікае з аналізу легальнага вызначэння зместу паняцця аб’яднання наймальнікаў у Працоўным кодэксе Рэспублікі Беларусь, дзе ў якасьці ўдзельнікаў такіх аб’яднанняў вызначаны юрыдычныя і фізічныя асобы, якім заканадаўствам прадстаўлена права заключэння і спынення працоўнага дагавора з работнікам. У арт. 355 дадзенага кодэксу прадугледжваецца, што прадстаўніцтва інтарэсаў наймальнікаў на рэспубліканскім, галіновым, тэрытарыяльным узроўнях ажыццяўляюць адпаведныя аб’яднанні наймальнікаў. На такі падыход указваюць нормы і іншых нарматыўных прававых актаў, дзе аб’яднанні наймальнікаў, у дачыненні грамадскіх аб’яднанняў, выступаюць у якасьці асобных суб’ектаў праваадносін. У прыклад можна прывесці арт. 23 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб прафесійных саюзах» у пераліку суб’ектаў, што абавязаны выконваць правы прафсаюзаў, замацаваны як аб’яднанні наймальнікаў, так і грамадскія аб’яднанні. Падцвярджаецца гэта і практыкай заключэння пагадненняў. У прыватнасці ў межах Генеральнага пагаднення паміж Урадам Рэспублікі Беларусь, рэспубліканскімі аб’яднаннямі наймальнікаў і прафсаюзаў на 2019–2021 гады, якое было заключана 19 снежня 2018 года, ад аб’яднанняў наймальнікаў выступае Саюз некамерцыйных арганізацый «Канфедэрацыя прамыслоўцаў і прадпрымальнікаў (наймальнікаў)». Адначасова заўважым, што на галіновым узроўні пераважная большасць пагадненняў мае толькі два бакі – прафесійныя саюзы і адпаведныя дзяржаўныя органы, што па нашаму меркаванню, не дае магчымасць рэалізаваць у поўнай меры патэнцыял адпаведнай канстытуцыйнай нормы, якая замацоўвае неабходнасць трохбаковага сацыяльнага партнёрства, з адпаведнымі правамі і абавязкамі.

Асаблівае становішча займаюць самарэгулявальныя арганізацыі і шэраг іншых аб’яднанняў, адносна якіх сфарміравана (фарміруецца) адмысловая прававая рэгламентацыя. Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь у сваім рашэнні ад 14 сакавіка 2019 г. «Аб стане канстытуцыйнай законнасці ў Рэспубліцы Беларусь у 2018 годзе» абгрунтавана падкрэслівае неабходнасць аптымальнага выкарыстання ўплыву як дзяржаўна-прававога ўздзеяння, так і дзеяння ўнутранных механізмаў самарэгуляцыі, указваючы на неабходнасць прыняцця нарматыўных прававых актаў аб самарэгулявальных арганізацыях. Пры падрыхтоўцы і абмеркаванні праекта Закона Рэспублікі Беларусь «Аб

самарэгулявальных арганізацыях» [6], па нашаму меркаванню, можна звярнуць увагу ў тым ліку на магчымасці іх удзелу ў сацыяльным партнёрстве, вызначаючы перспектыўныя накірункі ўдасканалення заканадаўства.

Між тым, варта ўлічваць уплыў аб’яднанняў прадпрымальнікаў на практыку сацыяльнага партнёрства і сетку такіх аб’яднанняў, якая склалася за апошнія дзесяцігоддзі, існаванне іх у выглядзе грамадскіх аб’яднанняў і асацыяцый (саюзаў). На наш погляд, адначасова з далейшым стварэннем спрыяльных прававых ўмоў для развіцця бізнесу, патрабуецца пэўная карэкцыя прававой рэгламентацыі дзейнасці аб’яднанняў прадпрымальнікаў, у тым ліку накіраванай на замацаванне прававых механізмаў іх удзелу ў сацыяльным партнёрстве, у прыватнасці тых, якія функцыянуюць у форме грамадскіх аб’яднанняў, самарэгулявальных арганізацый.

**Бібліяграфічны спіс**


1. Дашкевич, А.Л. Использование понятия «объединение предпринимателей» в законодательстве Республики Беларусь / А.Л. Дашкевич // Консультант Плюс: Беларусь. Технология 3000 [Электронный ресурс] / ООО «ЮрСпектр». – Минск, 2019.
2. Колмакова, И.Д. Объединения предпринимателей (работодателей) как субъект регулирования социально-трудовых отношений в рамках социального партнерства / И.Д. Колмакова // Вестн. ЮУрГУ. – 2012. – № 22. – С. 143-146.
3. Войтик, А.А. Объединение нанимателей как равноправный субъект социального партнерства / А.А. Войтик [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://elib.bsu.by/bitstream/123456789/41787/1/99_%D0%B2%D0%BE%D0%B9%D1%82%D0%B8%D0%BA.pdf. – Дата доступа: 09.09.2019.
4. Караваев, П.С. Проект Закона Республики Беларусь «Об объединениях нанимателей» – решение накопившихся проблем / П.С. Караваев [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.kaznachey.com. – Дата доступа: 09.09.2019.
5. Дашкевіч, А.Л. Грамадскія аб’яднанні як суб’екты канстытуцыйна-прававых адносін у Рэспубліцы Беларусь / А.Л. Дашкевіч // Право и демократия: сб. науч. тр. / редкол.: В.Н. Бибило (гл. ред.) и др. – Минск: БГУ, 2010. – Вып. 21. – С. 33–42.
6. Министерство экономики Республики Беларусь приглашает принять участие в обсуждении проекта Закона Республики Беларусь «О саморегулируемых организациях» на стадии подготовки НПА [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.economy.gov.by/ru/act-list-ru/view/ministerstvo-ekonomiki-respubliki-belarus-priglashaet-prinjat-uchastie-v-obsuzhdenii-proekta-zakona-44747-2019/. – Дата доступа: 09.09.2019.